# Голас Радзімы

№ 31 (1965)
31 ліпеня 1986 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



На прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах нашай рэспублікі, у самых розных арганізацыях і ўстановах многія кіруючыя пасады займаюць людзі маладыя — 25—30 гадоў. Адзін з іх — Барыс Тарасаў, начальнік цэха на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя С. Кірава. НА ЗДЫМКУ: Барыс ТАРАСАЎ (справа) з токарам Леанідам БЯЛЯЎСКІМ. (Расказ пра Б. Тарасава «Вверх по служебной лестнице» чытайце на 4-й стар.).

Фота С. КРЫЦКАГА.

**РАЗВІЦЦЁ СТАРАЖЫТНАГА ПРОМЫСЛУ**

(«На блакітных гектарах «Волмы»)
стар. 3

**У ВЯЗЫНЦЫ ПРАЙШЛО СВЯТА КУПАЛАЎСКАЙ ПАЭЗІІ**

(«Працяг дарогі ў вечнасць»)
стар. 6

**У АСНОВУ АПАВЯДАННЯ ПАКЛАДЗЕНЫ ГІСТАРЫЧНЫ ФАКТ**

(«Беглы казак»)
стар. 6—7

ПАСЯДЖЭННІ КАМІСІІ

## ЗА МІР НА ЗЯМЛІ

У Мінску адбылося пасяджэнне Камісіі па замежных справах Вярхоўнага Савета БССР. Удзельнікі пасяджэння прынялі заяву Пастаяннай камісіі па замежных справах Вярхоўнага Савета БССР у сувязі з Міжнародным годам міру.

У заяве гаворыцца, што як ніколі актуальнай з'яўляецца цяпер задача прадухіліць ядзерную вайну, зберагчы мір на зямлі. Упершыню ў сваёй гісторыі чалавецтва стала перад небяспекай прарыву гонкі ўзбраенняў у космас, якая пагражае самымі цяжкімі вынікамі. Трывожна нарастаюць абароты раскручваемай мілітарызмам гонкі ядзерных і іншых узбраенняў.

Беларуская ССР, з'яўляючыся адной з дзяржаў — заснавальніц ААН, прыкладае ўсе магчымыя намаганні для садзейнічання рэалізацыі мэт Міжнароднага года міру. Створаная ў рэспубліцы камісія па яго правядзенню разгарнула актыўную дзейнасць на гэтым напрамку.

Беларускі народ, які на сабе зведаў усе бедствы і гора вайны, рашуча змагаецца за мір. Сацыялізм і мір непадзельныя. Масавыя выступленні грамадскасці за раззбраенне і мір — неад'емная рыса палітычнага жыцця рэспублікі.

Члены Камісіі па замежных справах Вярхоўнага Савета Беларускай ССР перакананы, што Міжнародны год міру можа і павінен быць азнаменаваны дасягненнем важкіх дагаворанасцей па спыненню гонкі ўзбраенняў на Зямлі і прадухіленню яе ў космасе, па істотнаму скарачэнню ўзбраенняў, урэгуляванню рэгіянальных канфліктаў. Час для гэтага яшчэ ёсць. Аднак дарагая кожная мінута. Крайне неабходны адказны, прасякнуты інтарэсамі ўсеагульнай бяспекі падыход усіх дзяржаў да справы міру.

Камісія па замежных справах Вярхоўнага Савета Беларускай ССР выказвае надзею, што Міжнародны год міру, памнажаючы намаганні ўрадаў, парламентаў і народаў у барацьбе супраць пагрозы вайны, пераросце ў дзесяцігоддзе міру. Важна, каб кожны наступны год станавіўся яхой на шляху да свету без войнаў і зброі. У XXI стагоддзе чалавецтва павінна ўвайсці з упэўненасцю ў неазмрочанай магчымасці стваральнай працы.

СХОДЫ

## СВЯТА ПОЛЬШЧЫ...

Нацыянальнаму святу ПНР—42-й гадавіне Адраджэння Польшчы быў прысвечаны ўрачысты сход прадстаўнікоў працоўных, які адбыўся ў Мінску.

Шлях барацьбы і перамог, пройдзены народнай Польшчай за 42 гады,— адзначыў намеснік старшыні Беларускага аддзялення таварыства савецка-польскай дружбы, рэдактар газеты «Звязда» А. Тоўсцік, — гэта шлях савецка-польскага брацтва па зброі, станаўлення і развіцця дружбы і супрацоўніцтва паміж нашымі народамі. Ва ўмацаванні гэтых сувязей важкі ўклад Беларусі, якая ў рамках СЭУ пастаўляе ў брацкую краіну трактары, аўтамабілі, сіласныя камбайны, станкі, тавары народнага спажывання і многае іншае. Усе вобласці рэспублікі плённа супрацоўнічаюць з ваяводствамі ПНР.

Стварэнне суверэннай і сапраўды дэмакратычнай дзяржавы стала магчымым дзякуючы перамозе над фашызмам, вызваленню краіны Чырвонай Арміяй, разам з якой змагаліся салдаты Войска Польскага, падкрэсліў генеральны консул ПНР у Мінску Я. Рачкоўскі, які выступіў на сходзе. Пры жыцці аднаго пакалення дасягнуты значныя сацыяльныя пераўтварэнні: ліквідавана беспрацоўе, на новы ўзровень узнята адукацыя, навука і культура. Планам сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі, распрацаваным на цяперашнюю пяцігодку, намечана замацаваць і развіць поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве.

## ...І КУБЫ

У сталіцы рэспублікі адбыўся і ўрачысты сход прадстаўнікоў працоўных, прысвечаны рэвалюцыйнаму святу Кубы — Дню нацыянальнага паўстання—33-й гадавіне штурму казармы Манкада.

Дакладчык — член праўлення Беларускага аддзялення Таварыства савецка - кубінскай дружбы, старшыня Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню Г. Бураўкін адзначыў, што подзвіг героя̆ бясстрашнага штурму быў пралогам кубінскай рэвалюцыі, якая з'явілася працягам рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, пачатага Вялікім Кастрычнікам.

Дастойны ўклад у развіццё савецка-кубінскіх адносін уносяць працоўныя Беларусі. На востраве Свабоды добра вядомы беларускія трактары, аўтамабілі, прыборы, станкі. Плённа супрацоўнічаюць многія працоўныя і творчыя калектывы дзвюх рэспублік. Сотні кубінскіх юнакоў і дзяўчат вучацца ў навучальных установах Беларусі.

Аб дасягненнях сваёй краіны ў эканамічным, сацыяльным і культурным будаўніцтве расказала выступіўшая на сходзе прадстаўніца зямляцтва кубінскіх студэнтаў, якія вучацца ў Мінску, Мірта Іордзі.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ



**На бавоўнапрадзільнай фабрыцы Гродзенскага прадзільна-ніткачнага аб'яднання задзейнічаны 32 новыя кордачасальныя машыны румынскай фірмы «Унірэа». Яны ў 2—2,5 раза больш прадукцыйныя за існуючыя, дазволілі значна палепшыць якасць працы і ўмоў працы. Змантавана і абкатана абсталяванне румынскімі і савецкімі спецыялістамі.**
**НА ЗДЫМКУ: участак новых кардачасальных машын.**

ЗАМЕЖНЫЯ ПАЕЗДКІ

## СЯБРУЮЦЬ ДЗЕЦІ

У сталіцу Вялікабрытаніі Лондан прыбыла дэлегацыя піянераў і школьнікаў з Мінска і Мінскай вобласці. Па запрашэнню англійскай дзіцячай арганізацыі «Лясны народ» савецкія дзеці будуць гасцямі дзіцячага летняга лагера ў мястэчку Грасінгтан (графства Йоркшыр).

Упершыню за апошнія дзесяць гадоў савецкім школьнікам выпала магчымасць зрабіць такую паездку. Экскурсіі, выступленні мастацкай самадзейнасці, спартыўныя гульні і спаборніцтвы, дыскусіі ля кастра па хвалюючых дзіцячыя сэрцы праблемах—усё гэта чакае беларускіх школьнікаў у Грасінгтане. Але самае галоўнае—гэта непасрэдны кантакт, які дасць магчымасць юным прадстаўнікам дзвюх краін лепш пазнаць і зразумець адзін аднаго.

Знамянальны той факт, што наш летні лагер адкрываецца ў аб'яўлены па рашэнню ААН Міжнародны год міру,—заявіла адна з кіраўнікоў лагера Джэйн Уорд.—Сёняшнім савецкім і англійскім школьнікам трэба будзе жыць у XXI стагоддзі, і ад таго, як яны змогуць дасягнуць узаемаразумення, залежыць мірная будучыня нашай планеты. Знайсці агульную мову, весела і з карысцю правесці час — іменна такую магчымасць мы і хочам прадаставіць ім у нашым лагеры.

Дж. Уорд пажадала, каб падобныя кантакты пастаянна пашыраліся і мацнелі.

МІНСКАЕ МЕТРО

## ПА ПРЫНЦЫПУ СКОРАСШЫВАЛЬНІКА

Звычайны канцылярскі скорасшывальнік падказаў метрабудаўцам Мінска магчымасць у некалькі разоў скараціць расход металу пры будаўніцтве тунеляў. На чарговым пускавым участку першай лініі яны паспяхова выпрабавалі новую канструкцыю жалезабетоннай «абшыўкі» тунеляў, якая, дзякуючы арыгінальнаму спосабу злучэння бетонных кольцаў, у многім стала такой жа трывалай, як чыгунная. Надзейнасць і герметычнасць канструкцыі забяспечылі спецыяльныя «сашчэпкі».

Цяпер на прадпрыемствах прамысловай базы метрабуда завяршаецца пераснастка ліній для выпуску жалезабетонных блокаў новай канструкцыі. Паралельна асвоена вытворчасць новага па саставу бетону. Усё гэта дазволіць шырока выкарыстоўваць навінку на збудаванні другой лініі метрапалітэна, рэзка скарацproperly... 

АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ

## «СВЯТЛО» ЗАМЕСТ БРЫГАДЫ

Як на далоні бачаць асвятляльную сістэму вялікага горада дыспетчары Наваполацкага вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Дапамагае ім у гэтым аўтаматызаваны комплекс «Святло», прызначаны сачыць за эканомным выкарыстаннем вулічнага асвятлення.

Электронны памочнік узяў на сябе нялёгкія абавязкі цэлай дзяжурнай брыгады. Яшчэ нядаўна электрыкі і вадзіцель спецмашыны кожны, тыдзень аб'язджалі каля сарака падстанцый, затрачваючы аднаго бензіну па паўтары тысячы літраў у год. Цяпер жа ўсю неабходную інфармацыю можна атрымаць у лічаныя секунды непасрэдна на дыспетчарскім пульце. Адсюль лёгка і зручна «камандаваць» дзесяткамі тысяч лямпачак ва ўсіх жылых мікрараёнах.

Укараненне аўтаматыкі дасць штогадовую эканомію электраэнергіі 164 тысячы кілават-гадзін. Гэтага немалога запасу Наваполацку хопіць на чатыры дзесяткі самых доўгіх начэй.

ПРАПАНАВАЛІ ВУЧОНЫЯ

## РЭЦЭПТ ДЛЯ ГРАНІТУ

Не вазіць дарагі граніт, мармур, малахіт, іншыя прыродныя камяні далёка з кар'ераў, што знаходзяцца па-за рэспублікай, а вырабляць іх з адходаў Мікашэвіцкага камбіната нярудных матэрыялаў — такую ідэю прапанавалі беларускія вучоныя. Тэхналогію вырабу заменнікаў, якія па колеравай гаме нават багацейшыя, чым пліты з прыродных горных парод, распрацавалі спецыялісты Мінскага навукова-даследчага інстытута будматэрыялаў і Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР.

ЖНІВО

## АБМАЛОТ ПАД ДАХАМ

У саўгасе «Спорава» Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці абмалот скошаных збожжавых культур вядуць пад дахам. Гэты спосаб абяцае адчувальную выгаду: жніво не залежыць ад надвор'я, паскараюцца яго тэмпы.

Цыкл работ пачынаецца са скошвання. Трактары дастаўляюць масу з поля на стацыянарную пляцоўку. Тут абсталявана паточная лінія для абмалоту.

Перавагі безадходнай індустрыяльнай тэхналогіі ўборкі збожжавых відавочныя. Паводле падлікаў эканамістаў, яна дазваляе павысіць прадукцыйнасць працы на жніве на 76 працэнтаў, на 67,3 працэнта знізіць сабекошт работ.

ЮБІЛЕІ

## ВЕРХНЯДЗВІНСКУ — 600 ГАДОЎ

Паданні глыбокай старадаўнасці, старонкі гісторыі і сучаснасці ажылі нядаўна ў адзін з выхадных дзён на вуліцах, у парках і скверах старажытнага Верхнядзвінска. Так жыхары аднаго са старэйшых райцэнтраў Віцебшчыны вялікім і маляўнічым тэатралізаваным прадстаўленнем адзначылі шасцісотгоддзе роднага горада.

Тысячы гараджан, гасцей з розных канцоў рэспублікі, сяброў-суседзяў з Прыбалтыкі сталі сведкамі і ўдзельнікамі святкаванняў, прысвечаных знамянальнай даце. І гістарычныя сцэнкі, разыграныя мясцовымі культработнікамі, і пераклічка ветэранаў Вялікай Айчыннай, і ўшанаванне перадавікоў вытворчасці, лепшых людзей Верхнядзвінска пакінулі глыбокі след у душы кожнага, хто дакрануўся да невычэрпнай крыніцы памяці, хто яшчэ раз змог пераканацца: горад, насуперак немаладым гадам, малады і поўны аптымізму.

ЗДРАЎНІЦЫ

## ДЗЕ СІНЕЮЦЬ АЗЁРЫ

У сасновым лесе, напоўненым пахамі смалы, на тэрыторыі Любанскага раёна размясціўся санаторый «Рассвет». Тут адпачываюць і папраўляюць сваё здароўе сельскія механізатары, жывёлаводы, паляводы.

У рэспубліцы створана аб'яднанне міжкалгасных здраўніц «Белміжкалгасздраўніца». Яно і займаецца паляпшэннем санаторна-курортнага абслугоўвання калгаснікаў і іх дзяцей. Сёння ў яго сістэме — шэсць аздараўленчых устаноў. Гэта санаторыі «Бярэсце», «Парэчча», дзіцячы «Случ» і іншыя. Усе яны размясціліся ў маляўнічых месцах.

Сетка калгасных здраўніц у Беларусі ўвесь час расшыраецца. У гэтай пяцігодцы будуць уведзены ў строй санаторыі «Радон», «Бярозка», першая чарга санаторыя «Завішша». Плануецца будаўніцтва санаторыя на беразе самага вялікага і прыгожага ў рэспубліцы возера Нарач.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

МІНСК. Здольнасць аператыўна перастройвацца на выпуск новай прадукцыі набылі станкі тыпу «апрацоўчы цэнтр» на Мінскім аўтамабільным заводзе. Тут пачала дзейнічаць аўтаматызаваная сістэма падрыхтоўкі праграм для такіх комплексаў. Прымяненне камп'ютэрнай тэхнікі прыметна спрасціла гэты працэс і амаль у дзесяць разоў павысіла прадукцыйнасць працы праграмістаў. Новая тэхналогія поўнасцю выключае памылкі пры складанні тэхнічных заданняў.

БАРАНАВІЧЫ. У саўгасе-камбінаце «Мір» Баранавіцкага раёна створаны буйны конегадоўчы комплекс. У ім дзевяць канюшань, даільны цэх, радзільнае аддзяленне, памяшканні для дагадоўвання жарабят. Новую галіну гаспадарка будзе развіваць па двух напрамках—племяннному і прадукцыйнаму. У недалёкай будучыні саўгас стане выпускаць у суткі паўтары тоны каштоўнага напітку — кумысу. «Мір» будзе пастаўляць многім гаспадаркам племянных жарабят.

СМАЛЯВІЧЫ. Духмяны чай з мёдам, фруктовыя і ягадныя жэле, малочныя кактэйлі, вітамінныя напіткі, фірменныя стравы прапануе наведвальнікам дзіцячае кафэ «Вясёлка», адкрытае ў раённым цэнтры. Да паслуг малышоў і іх бацькоў—цудоўны свет казак, па матывах якіх аздоблены інтэр'еры. Крэслы і сталы ўпрыгожаны пляценнямі з лазы, разьбой па дрэву, залацістай саломкай аформлены пано.

РЫБАВОДСТВА І РЫБАЛОЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ

# НА БЛАКІТНЫХ ГЕКТАРАХ «ВОЛМЫ»

Беларусь, як вядома, не мае непасрэднага выхаду да марскіх басейнаў. Праўда, у нас шмат, больш за дзесяць тысяч, азёраў, а таксама мноства вялікіх і малых рэчак. Разам з вадасховішчамі і штучнымі сажалкамі, якіх становіцца ўсё больш, яны маюць важнае значэнне для забеспячэння насельніцтва нашай рэспублікі рыбай.

Асноўныя кірункі вытворчасці рыбапрадукцыі сёння — развядзенне ў сажалках, садках, басейнах таварнай рыбы і інтэнсіфікацыя рыбаводства і рыбалоўства на натуральных вадаёмах.

Сажалкавае рыбаводства пачало развівацца ў Беларусі яшчэ ў даваенны перыяд. Менавіта тады з'явіліся такія гаспадаркі, як «Волма», «Трэмля», «Вілека», «Белае»... Нядаўна я пабываў ў адной з іх — рыбакамбінаце «Волма».

— Сапраўды, наша гаспадарка адна са старэйшых у рэспубліцы, — расказваў галоўны інжынер рыбакамбіната Васіль Самойленка. — Калісьці, на самым пачатку, яна давала 50 тон рыбы ў год. А летась мы рэалізавалі тысячу тон.

50 тон і адна тысяча... Уражвае. А каб вы, паважаныя чытачы, маглі лепш уявіць той прагрэс, што адбыўся і ў рыбакамбінаце «Волма» і ў рыбнай гаспадарцы рэспублікі ўвогуле, прывяду яшчэ некалькі лічбаў. Колькасць леташняй прадукцыі «Волмы» складвае палавіну гадавой лоўлі рыбы ва ўсёй рэспубліцы перад Вялікай Айчыннай вайной. Цяпер жа здабываючыя прадпрыемствы Беларусі даюць у год амаль 17 тысяч тон жывой і свежай рыбы. У асноўным — карпа, які гадуецца ў сажалках. Яшчэ разводзяць у нас каштоўныя пароды, завезеныя з Сярэдняй Азіі і Далёкага Усходу: белага амура, плямістага таўстапобіка, фарэль. На таварных, як называюць іх спецыялісты, азёрах і рэках здабываюцца традыцыйныя для Беларусі акуні, шчупакі, карасі, вугры...

Мне цікава было на ўласныя вочы пагладзець, як працуюць рабочыя на сажалках, даведацца, як збіраецца добры «ўраджай» рыбы.

Самойленка прапанаваў паехаць на адзін з участкаў гаспадаркі, які ўзначальвае патомны рыбак Мікалай Крывіцкі.

Наша машына імчала па шэрай стужцы асфальту. Паварот, другі — і мы апынуліся на парослай маладым ляском валатоўцы, вакол якой рассыпаліся пацеркі сажалак.

— Гэта наш цэнтральны ўчастак, — тлумачыў Самойленка.— Плошча яго 750 гектараў. Вылоўліваем 600 тон рыбы, больш за палавіну ўсёй прадукцыі рыбакамбіната.

Мікалая Крывіцкага мы знайшлі на складзе камбікармоў. Ён камусьці гаварыў:

— Лічу, што трэба дадаць корму, — данеслася да нас. — Толькі ўважліва яшчэ раз вечарам праверце ўсе «кропкі».

Пазней я даведаўся, што «кропкі» — гэта спецыяльна адведзеныя месцы на сажалцы, дзе корміцца рыба. Сюды на лодках дастаўляецца грануляваны пажыўны корм. Пры гэтым вельмі важна, каб на «кропках» не заставалася нічога ад ранейшых порцый.

Пра гэта мне расказаў Пётр Чарвяк, з якім мы выязджалі на лодцы. Пётр — мясцовы. Калісьці маладым хлопцам паехаў у Мінск, працаваў там шаферам.

— І ўвесь час успамінаў родныя мясціны, наш рыбацкі пасёлак Азёрны,—расказваў Пётр, пакуль наша лодка павольна рухалася, падмінаючы невялічкія хвалі, якія ўздымаў вецер.— А аднойчы так зашчымела сэрца, што зразумеў: трэба вяртацца, не магу больш без гэтай прыгажосці, рыбацкага клопату, незабыўных світанкаў...

Пазней нехта з рыбакоў сказаў: «Мы сустракаем світанкі ў полі». І мне падумалася: а сапраўды ж, праца рыбакоў сажалкавых гаспадарак у многім нагадвае працу селяніна. Супадаюць нават цыклы работ. Вясной на сажалках таксама пачынаюцца аграмеліярацыйныя работы: расчыстка, ворыва, баранаванне, унясенне арганічных і мінеральных угнаенняў — усё гэта для таго, каб палепшыць натуральную кармавую базу, затым «пасадка» малькоў, зарыбленне. І падкормку трэба праводзіць рэгулярна, і сачыць, каб рыба не хварэла... Толькі тады будуць добрыя ўловы.

У рыбакамбінаце «Волма» сярэдняя прадукцыйнасць сажалак — 9-10 цэнтнераў з гектара, у перспектыве—14-15 цэнтнераў. Праўда, ужо сёння лепшыя брыгады, як, напрыклад, калектыў Уладзіміра Корзуна, бяруць з гектара і па 17 цэнтнераў рыбы.

У планава-эканамічным аддзеле рыбакамбіната мне расказалі, як размяркоўваецца даход, што атрымлівае гаспадарка ад рэалізацыі сваёй прадукцыі. Гэта — амаль 2 мільёны рублёў. Ідуць грошы на догляд сажалак, механізацыю працы рыбакоў, паляпшэнне іх бытавых умоў.

...У Дзяржаўным камітэце БССР па рыбнай гаспадарцы ёсць карта: на ёй адзначаны рыбгасы і рыбакамбінаты рэспублікі. Колькасць іх расце, асабліва ў выніку будаўніцтва рыбаводна-меліярацыйных комплексаў у зоне асваення зямель Палескай нізіны. У апошнія гады пабудаваны і ўведзены ў дзеянне такія буйныя гаспадаркі, як «Любань», «Лактыўшы», «Палессе» і іншыя. На сажалках і вадаёмах, рэках і азёрах працуюць каля 3 тысяч чалавек. Іх прадукцыя — жывая, ахаладжаная, вэнджаная, сушана-вяленая рыба. Вялікім попытам у Беларусі карыстаюцца і кансервы з рыбы мясцовага ўлову: вугор у жэле, вугор гарачага вэнджання, карп, плотка, сазан... У Мінску, напрыклад, прадукцыю беларускіх рыбакоў можна купіць у спецыялізаваных рыбных магазінах «Акіян» і «Нептун», у многіх прадуктовых магазінах.

Дададзім, што па вытворчасці рыбы на душу насельніцтва Беларусь займае адно з першых месцаў у Савецкай краіне.

**Уладзімір МЯЛЕШКА.**



Беларускія рыбакі на промысле.





# СУПРАЦЬ «РАСКАВАНАГА АТАМА»





Як вядома, у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС тры раёны Беларусі — Нараўлянскі, Брагінскі і Хойніцкі — у першыя дні і тыдні аказаліся ў складанай сітуацыі. Абстаноўка там сёння, праз тры месяцы пасля пачатку бяды, якую прынёс «раскаваны атам», нармалізуецца. З мэтай ліквідацыі вынікаў аварыі ажыццёўлены шматлікія арганізацыйныя і практычныя мерапрыемствы. Яны праводзіліся ў некалькі этапаў.

Самым кароткачасовым і напружаным быў першы — эвакуацыя насельніцтва з месцаў, дзе павысіўся радыяцыйны фон. У надзвычай сціслыя тэрміны адсюль былі цалкам эвакуіраваны 17 гаспадарак, вывезены больш як 25 тысяч чалавек. Амаль палавіна з іх — школьнікі, маці з малымі дзецьмі, цяжарныя жанчыны. Яны былі размешчаны ў лепшых піянерскіх лагерах, дамах адпачынку, прафілакторыях краіны.

Кожны эвакуіраваны, а затым і кожны жадаючы, хто звярнуўся ў адкрытыя ў розных гарадах Беларусі пункты дазіметрыі, прайшоў спецыяльныя абследаванні, з дапамогай якіх трымалася пад кантролем магчымае апраменьванне. **За гэты час на тэрыторыі рэспублікі не выяўлена ніводнага выпадку захворвання прамянёвай хваробай.**

Сёння, пасля правядзення работ па дэзактывацыі, у некаторыя населеныя пункты вяртаюцца людзі. А для тых, хто пакуль вярнуцца не мае магчымасці, будуецца жыллё ў паўночных раёнах Гомельшчыны. Да кастрычніка 1986 года тут будзе здадзена ў эксплуатацыю 4 тысячы дамоў.

Вядома, работы, якія вядуцца ў Беларусі па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, настолькі маштабныя, што сіламі адной Гомельскай вобласці і нават рэспублікі выканаць іх было б вельмі цяжка.

Таму на правядзенне мерапрыемстваў па ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай АЭС Савецкая дзяржава выдаткавала значныя сродкі. **Усе эвакуіраваныя атрымалі грашовую дапамогу, яны былі бясплатна забяспечаны адзеннем, абуткам, таварамі бытавога і культурнага прызначэння, харчаваннем, атрымалі часовае жыллё і работу.**

Трэба сказаць, што ўсе пытанні, звязаныя з работамі па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, пастаянна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ЦК КПБ і ўрада рэспублікі.

**НА ЗДЫМКАХ: першы сакратар Нараўлянскага райкома партыі М. ХОБАТАЎ сярод будаўнікоў трэста «Калінкавічыводбуд»; касавіца на Гомельшчыне; жыхар Нараўлянскага раёна Уладзімір ФІСЮК; урачы вядуць пастаянны дазіметрычны кантроль за станам паветранага асяроддзя.**

**Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.**

*НАЧАЛЬНИКУ ЦЕХА — 29 ЛЕТ*

# ВВЕРХ ПО СЛУЖЕБНОЙ ЛЕСТНИЦЕ

Рассказать о молодом руководителе — такая задача стояла передо мной. Найти подходящую кандидатуру не составляло большого труда. Я решил пройтись по своим журналистским адресам, отыскать молодых людей, с которыми в последние годы доводилось встречаться и которые, по-моему, весьма успешно начинали свою деловую карьеру. Как выяснилось, все они продвинулись по службе и теперь уже работают на других должностях. Один — заведующим сектором, второй — ведущим конструктором, третий — председателем колхоза, четвертый — начальником цеха... На нем, на начальнике цеха, я и остановил свой выбор.

Борису Тарасову 29 лет. Он руководит механическим цехом на Минском станкостроительном заводе имени С. Кирова. Предприятие крупное, известное в нашей стране и за рубежом. Протяжные и отрезные металлорежущие станки, выпускаемые здесь, экспортируются примерно в 40 стран мира.

Когда четыре года назад мы познакомились с Борисом Тарасовым, он возглавлял бюро отдела труда и заработной платы. На должность начальника цеха его назначили полтора года назад. По словам генерального директора завода, Борис Тарасов успешно справляется со своими обязанностями на новом посту. Подтверждением этого может служить и тот факт, что цех, которым руководит Тарасов, сегодня выпускает продукции на 40 процентов больше, чем полтора года назад.

С чего же начиналась его деловая карьера? Об этом рассказывает сам Борис:

— Я пришел работать на завод сразу после окончания Могилевского политехнического техникума. Начинал контролером в отделе технического контроля. Правда, работал здесь совсем недолго: через полгода мне предложили должность мастера, и я с удовольствием согласился. Эта работа была интереснее, давала больше возможностей проявить себя. Потом была следующая ступенька — старший мастер. Затем, как вы знаете, четыре года руководил бюро отдела труда и заработной платы. Здесь уже приходилось заниматься чисто экономическими вопросами. Не скажу, что эта работа мне очень нравилась, но, тем не менее, я старался отдаваться ей полностью.

— И вас заметили, когда встал вопрос, кого назначить на вакантную должность начальника цеха?

— Я стремился работать хорошо не с целью получить более высокую должность. Каждый человек должен выполнять свою работу честно, независимо от того, где и кем он трудится.

— И тем не менее, для сегодняшней молодежи честолюбие довольно характерная черта. Безусловно, ничего плохого в этом нет.

— Согласен. Как говорится, плох тот солдат, который не мечтает стать генералом. Важно только, чтобы это были не чрезмерные амбиции. Надо реально оценивать свои силы и способности, тогда не будет и утраченных иллюзий. Что же касается меня, то я, откровенно говоря, не рассчитывал на такой быстрый рост. Новое назначение было несколько неожиданным. Дело в том, что в таких случаях обычно проходят еще ступеньку — заместителя начальника цеха. Это, конечно, необязательно, но все же на практике чаще бывает именно так — заместитель начальника, потом начальник. Этот скачок, правда, меня не очень смущал. Мне предлагали руководить цехом, где я трудился все это время — почти десять лет. Могу сказать, что я уже довольно хорошо знал людей и они меня тоже, мы легко находили общий язык, у нас были доброжелательные отношения. Производство мне также было хорошо знакомо: работа мастера — отличная школа для любого руководителя. Мою кандидатуру генеральный директор завода предложил коллективу цеха. Рабочие одобрили. Кстати, последнее слово всегда остается за рабочими. Администрация не назначит руководителем человека, которого не поддерживает коллектив.

— У вас были трудности на новой должности?

— Были. Особенно в первые несколько месяцев. Преимущественно это касалось контактов с другими цехами и службами завода. Не с каждым руководителем мне и теперь удается решать все вопросы быстро.

— Сказывается разница в возрасте?

— Не думаю. У нас большинство руководителей так называемого среднего звена люди как раз молодые: примерно моих лет или на тричетыре года старше. Причина здесь скорее в разнице характеров, стилей работы. Например, с начальником планового отдела, человеком молодым, мы с трудом находим общий язык, в то время, как с 50-летним начальником отдела труда и заработной платы мы без проблем решаем любой вопрос.

— А как в цехе складываются отношения с людьми?

— У меня 205 подчиненных, и могу сказать, что почти со всеми и практически во всех случаях мне удается наладить контакты. Безусловно, бывают спорные вопросы, но в конце концов мы приходим к общему мнению.

Мы беседовали с Борисом Тарасовым в его служебном кабинете. Правда, здесь он проводит мало времени, только когда работает с документами. Большую часть рабочего дня Борис находится в цехе. Все вопросы решаются там, в том числе и личные, если они, естественно, не требуют основательной беседы. Если же вопрос серьезный, начальник пригласит после смены зайти к нему в кабинет.

По вечерам Борис Тарасов занимается в политехническом институте. Сейчас он закончил третий курс факультета роботов и робототехнических систем. Учиться еще три года. Словом, свободного времени у него практически нет, разве что выходные дни. Наилучший отдых для Бориса — рыбалка.

Возможно, в скором времени в его жизни произойдут изменения: Борис Тарасов собирается жениться. Да, в двадцать девять лет он начальник цеха и пока холостой. Если первое ему импонирует, то вторым Тарасов явно недоволен.

Игорь ГЕРМЕНЧУК.







**Интересно проводят свободное время учащиеся Молодечненского профессионально-технического училища строителей. Спорт, пожалуй, у них особенно популярен. Среди других занятий — кружок, готовящий теле- и радиопередачи, которые транслируются по внутренней сети. Руководит кружком инженер лаборатории технических средств обучения Александр Галунов. В распоряжении юношей и девушек — телевизионная установка, видеомагнитофоны, звуковоспроизводящая и киноаппаратура.**

**НА СНИМКАХ: ведущая телевизионных программ Елена КОКАРЕВА; руководитель кружка Александр ГАЛУНОВ (второй слева) с учащимися готовятся к съемкам нового киносюжета; в телестудии училища.**

**Фото В. АЛЕШКЕВИЧА.**

# «ПРОШУ ВАС, ПОМОГИТЕ...»

**Газета «Комсомольская правда» является органом Центрального Комитета Всесоюзного Ленинского Коммунистического Союза Молодежи (ВЛКСМ). Комсомол Советской страны — самодеятельная общественно-политическая организация, насчитывает в своих рядах более 42 миллионов членов, юношей и девушек в возрасте до 28 лет. Среди почти 8,5 тысяч газет, выходящих в нашей стране, «Комсомольская правда», первый номер которой вышел в 1925 году, — одна из самых популярных. Сейчас ее ежедневный тираж составляет 15 миллионов экземпляров.**

**В предлагаемом материале мы познакомим вас с работой отдела писем редакции.**

У 30-летней москвички Натальи Моржиной довольно необычный «послужной список»: она двух человек восстановила на работе, одного спасла от позора и тюрьмы, вернула двум ребятишкам их отца, а жене — мужа и познакомила друг с другом многих стеснительных молодых людей. Наташа — ведущая ежемесячной колонки «Письма-Письма» в центральной молодежной газете страны — «Комсомольская правда». «У моих коллег по редакции достижения куда больше, — говорит Наташа.— И в колонке я рассказываю о работе всей редакции. А тут уже речь идет о судьбах сотен людей».

Писем в «Комсомолку» приходит много — не менее тысячи в день. Но мы с Наташей говорим только о тех из них, которые просят или требуют помощи. Некоторые даже начинаются вместо традиционного «Уважаемая редакция!» со слов «Прошу вас, помогите...» Такие письма требуют быстрых и квалифицированных действий: часть их передается обозревателям, специальным корреспондентам редакции. Часть — пересылается в судебные, следственные органы, в государственные учреждения, депутатам с сопроводительным обращением самой «Комсомолки» и держится редакцией на контроле.

Результат? Наташа дала мне подборку колонок «Письма-Письма» за три года. Я выбрал данные лишь двух из них: июльской 1986 года — она к моменту нашего разговора была последней по времени — и февральской 1983 года, когда такая статистика впервые начала появляться на полосе (данные за этот год — в скобках).

— объявлено различных выговоров за неправильные действия в отношении молодых работников . . . . 153 (64);

— освобождено от занимаемой должности . . 26 ( 4);

— возбуждено уголовных дел . . . . . . . 16 (12).

Это только 3 из 10—12 позиций, по которым ведется статистика. Всего же в двух выбранных колонках сообщалось о 378 результатах редакционных расследований по читательским письмам (в феврале 1983 года — о 102).

Как видно, число таких расследований растет. И именно в то время, когда порядка в стране становится, по признанию самой молодежи, заметно больше. Парадокс?

«Скорее, закономерность, — говорит Наташа. — Во-первых, в условиях активизации общественной жизни, особенно после XXVII съезда КПСС (февраль-март 1986 год), люди критикуют многое из того, мимо чего раньше проходили, стараясь не замечать. Во-вторых, сама правозащитная деятельность газеты увеличивает не только авторитет издания, но и поток писем. Есть, правда, и издержки этого процесса: порой читатели ставят перед нами проблемы, которые можно без труда решить на месте — с помощью депутата (кстати, каждый третий депутат местных органов власти в СССР — молодой человек), в ближайшей адвокатской конторе, а то и просто обратившись в свою профсоюзную или молодежную организации. И я уже несколько раз вынуждена была призывать в колонке: прежде чем отправлять письмо в редакцию — подумайте, все ли вы сделали сами для решения своей проблемы».

Я спросил Наташу, что для нее главнее в работе на колонку?

«Сам факт помощи, его психологический эффект, — ответила она. — По себе знаю, как важно молодому человеку быть уверенным, что справедливость, какой бы трудной или даже скверной стороной ни поворачивалась к тебе жизнь, обязательно восторжествует. Эта уверенность необходима для нормального нравственного развития организма так же, мне кажется, как для нормального физического развития витамины».

**Сергей ЗАЙЦЕВ.** (АПН).

# БЕГЛЫ КАЗАК

**Генадзь ЛАНЕЎСКІ нарадзіўся ў 1925 годзе на Расоншчыне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Зараз працуе метадыстам у адной з мінскіх школ рабочай моладзі.**

**З апавяданнямі выступаў у часопісах «Маладосць», «Бярозка»; газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена». Піша на гістарычна-краязнаўчую тэму. У выдавецтве «Юнацтва» ў бліжэйшы час выходзіць яго кніга «Паданні роднага краю».**

**У аснову апавядання «Беглы казак» пакладзены вядомыя гістарычныя факты аб знаходжанні Емяльяна Пугачова ў стараверaў Веткі на Беларусі.**

Пах жывіцы і верасу застаўся ззаду, казак спыніў каня на краі ўзгорка, які пераходзіў у лагчыну, парослую падлескам. У лагчыне — балота з непралазным па краі хмызняком: крушыннік, алешнік, лазняк, далей — багун і дурніцы. Удалечыні праглядвалі бясконцыя купінкі, на якіх у зарасніках рагозу чарнелі балотныя вокны. Дзе-нідзе на балоце былі і выспы, парослыя стройнымі смалістымі соснамі і ядлоўцам. Ля выспаў — роўнядзь парыжэлай асакі з кволымі сасонкамі.

Казак саскочыў з сядла, падвёў тарпана да лазняку. Да сядла была прытарочана стрэльба, торба і сырая, яшчэ са слядамі крыві шкура балотнай рысі.

Коннік прытаміўся ад доўгай язды. Пацягнуўся, расправіў шырокія плечы. Яго пацёртую і месцамі падраную вопратку, у якой угадвалася форма данскога казацкага афіцэра, дапаўняла крывая шабля, два пісталеты за шырокім поясам.

Ён углядаўся ў далечыню і нібы зноў пачуў словы жанчыны, у якой хаваўся: «Прабірайся на поўдзень, там казакі, ды не захварэй у нашых стылых, цёмных лясах і балотах. Ад ветру хворасць на тыдзень, а ад вады на ўсё жыццё. Яшчэ помні: на балотах здані перагукваюцца, не едзь на іх покліч».

Хапае ў казака сілы, спрыту і адвагі. І ўсё ж лясы і балоты прыгняталі і нават палохалі яго, сына прывольных данскіх стэпаў.

Балота дурманліва пахла багуном, густой сумессю чашчобных траў. Казак, збегшы з царскага астрога, ведаў: недзе ў гэтых мясцінах ля ракі Сож ёсць паселішча Ветка, а ў ім стараверскі скіт, жыхары якога нібыта дапамагаюць беглым.

Раптам востры слых улавіў, як пад чыёй-та нагой зламалася галінка. Казак заўважыў чалавека, што асцярожна перабягаў за дрэвамі.

Той, відаць, зразумеў, што яго заўважылі, і выйшаў з-за дрэва. Выгляд у яго быў ваўкаваты: твар, зарослы густой шчэццю, з-пад калматых броваў зыркаюць вострыя вочы. Цэлы сажань у плячах, ды і ростам вышэй за казака на галаву.

«Мядзведзь барадаты!» — падумаў казак.

Барадач, выхапіўшы з-за халявы стаптанага бота кінжал, ішоў на яго.

І вось бразнула сталь скрыжаваных кінжалаў. Барадач імкнуўся сагнуць руку казака. Сіла ў яго была мядзведжая, але і праціўнік таксама не гнуўся. Яны дужаліся колькі хвілін, топчучыся па крузе, сціскаючы з усіх сіл кінжалы і гледзячы адзін аднаму ў вочы. Але ні погляды, ні мускулы ні ў аднаго не здрыгануліся. Толькі моцна вытаптаная глеба сведчыла аб сіле праціўнікаў.

Рукі з кінжаламі замерлі ў паветры, не хілячыся ні ў чый бок, і ім нічога не заставалася, як спыніць схватку.

— Не паддаўся мне, Мікуле! Вось дык казак! — дзівіўся ваўкаваты дзядзька. — Куды ж ідзеш?

— Куды птушка ляціць, — адказаў казак. — Вось толькі ў Ветку заскочыць трэба.

Гэта зацікавіла барадача.

— А ў Ветцы каго шукаеш?

— Старавераў.

— Пабажыся! — запатрабаваў Мікула.

Казак перахрысціўся двума пальцамі.

Гэта ўраз змяніла адносіны барадача, з ваўкаватага ён ператварыўся ў гасціннага дабрадзея.

Праз хвіліну яны ўжо сядзелі на траве і гутарылі, як старыя сябры. А яшчэ праз які час разам выйшлі на лясную сцяжынку, якая вывела іх да шырокай лясной ракі. Барадач назваў яе Сож.

Тут казак убачыў паселішча. У цэнтры яго ўзвышаўся храм, уздоўж вуліц драўляныя хаты, за імі гумны, такі, лазні. Паселішча было абнесена таксама драўляным тынам і загародкамі для жывёлы. Вакол бачыліся агароды, палі, ля Сожа — лугі.

Не заходзячы ў само паселішча, барадач павёў казака лесам да стараверскага храма — скіта.

— У храме сустрэнеш духоўніка, яму можаш адкрыцца, — сказаў Мікула.

Храм, схаваны ў гушчары лесу, быў невысокі, прадаўгаваты, з тоўстых смалістых бярвенняў, без купала. Казак даверыў барадачу каня з усім прымацаваным да сядла багаццем і пайшоў да храма. Зняўшы добра паношаную, прабітую куляй казацкую шапку, па дзвюх прыступках узняўся на ганак.

Дзверы на паперць і ў храм былі адчынены. У храме панаваў паўзмрок. Толькі ў алтары блішчэла святло лампады, ярка адбіваючыся ў залачоных аправах абразоў.

Казак перахрысціўся па-стараверску і агледзеўся.

Скрыпнула фортка царскіх варот, і з алтара выйшаў сівабароды стары.

— Мікула паслаў, — сказаў казак на яго нямое запытанне.

Стары доўга ўглядаўся ў твар прышэльца.

— Нашай веры? — спытаўся.

— Старой веры, — пацвердзіў казак.

Стары сеў на лаўку ля сцяны, запрасіў:

— Сядай, у нагах праўды няма. Як завуць і куды бяжыш?

Вельмі ўладарныя і пранізлівыя вочы былі ў старца. Мікулава настаўленне і сваё ўнутранае пачуццё падказвалі: не трэба таіцца ад духоўніка.

# ПРАЦЯГ ДАРОГІ Ў ВЕЧНАСЦЬ







Чым далей адыходзіць ад нас дзень, калі не стала народнага песняра Янкі Купалы, тым відавочней адчуваецца яго прысутнасць і ў жыцці, і ў літаратуры, на небасхіле якой талент яго па-ранейшаму зззяе зоркай першай велічыні. Другое стагоддзе вечнасці, якое пачалося некалькі гадоў назад, падаравала ўжо нямала цікавых і радасных сустрэч з паэзіяй сацыяльна напоўненай і рамантычна-акрыленай, па-зямному шчодрай і па-жыццёваму праўдзівай.

У гэты вянок вечнасці хораша ўпляліся і сустрэчы, што адбыліся сёлета, — у ліпені споўнілася 104 гады з дня нараджэння Янкі Купалы. Дзякуючы ініцыятыве супрацоўнікаў Літаратурнага музея песняра, у Вязынцы прайшло чарговае свята купалаўскай паэзіі. Як і ў ранейшыя гады, утульную паляну непадалёк ад хаты, у якой нарадзіўся будучы пясняр, запоўнілі сотні аматараў літаратуры.

Свята адкрыла ўступным словам дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы Ж. Дапкюнас.

З хваляваннем слухалі прысутныя голас самога Янкі Купалы — у аўтарскім выкананні прагучаў верш «Трэба нам песень». Як вядома, з ім пясняр звярнуўся пяцьдзесят гадоў назад да дэлегатаў і гасцей I Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў, на якім прадстаўляў беларускую дэлегацыю.

З успамінамі выступілі пісьменнікі А. Вольскі, С. Шушкевіч. Яны прыгадалі тыя моманты з уласнага жыцця, калі мелі магчымасць сустракацца з Іванам Дамінікавічам, гаварылі аб вялікім уплыве, які аказала і аказвае сёння на іх, як і на кожнага чытача, паэзія песняра, што абуджае самыя светлыя думкі і парыванні, дае магчымасць адчуць, чым жыў і жыве наш народ. У вянок памяці Купалы кладуцца радкі іх вершаў, напісаных у розныя гады.

Творы, прысвечаныя Купалу, Радзіме, бацькоўскай зямлі, чыталі М. Мятліцкі, А. Канапелька, М. Шаховіч.

Свята прадоўжылі прафесійныя і самадзейныя артысты. Ажыўлена было ля кніжных кіёскаў.

Вязынка прымала гасцей у нядзелю, а ў панядзелак у памяшканні Літаратурнага музея імя Янкі Купалы прайшлі «Купалаўскія паэтычныя чытанні», якія вёў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР В. Зуёнак.

Купалава дарога ў вечнасць працягваецца.

**НА ЗДЫМКАХ: так пачалося Купалаўскае свята паэзіі; ажыўлена ля кніжных кіёскаў; шмат песень прагучала ў той дзень у Вязынцы.**

**Фота А. КАЛЯДЫ.**

## НА ПАЛОТНАХ — КОСМАС

У Цэнтральным Доме мастакоў у Маскве праходзіла Ўсесаюзная выстаўка «Космас на службе міру». У ёй удзельнічалі і беларускія майстры. Мінскі графік Ю. Зайцаў прапанаваў некалькі работ, прысвечаных гісторыі і сённяшняму дню асваення космасу: «Каперпік», «Мара», «Трыумф касманаўтыкі». Цыкл графічных твораў «Сузор'е міру» прадстаўляе К. Хацяноўскі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі і прэміі Дж. Нэру Г. Паплаўскі прадставіў работы з серыі «Высокае неба».

## ДРУГОЕ ВЯРТАННЕ ПАЭТА

Сярод паэтаў, чый талент знічкай загарэўся на небасхіле заходнебеларускай паэзіі, адно з першых месцаў належыць Уладзіміру Жылку, самабытнаму майстру слова. Нядоўгім было ягонае жыццё — толькі трыццаць тры гады наканаваў яму лёс, ды зроблена ім у літаратуры нямала. Рупны даследчык і збіральнік напісанага У. Жылкам Уладзімір Калеснік адзначае: «У перапісцы У. Жылкі сустракаюцца выказванні, дзе ён папракае сябе за лішнюю ўскладнёнасць паэтычнай мовы, што перашкаджала яго творам даходзіць да масавага чытача. Смела можна сказаць, што тое, што было калісьці заганай, сёння стала прызнаным дасягненнем, бо культура сучаснай паэзіі, а адпаведна чытачоў, настолькі вырасла, што апошнія ахвотна шукаюць інтэлектуальнай і вобразнай ускладнёнасці, смакуюць духоўнасць».

Гэтымі словамі У. Калеснік завяршае свой артыкул «Пяснярскі лёс», змешчаны ў якасці прадмовы да зборніка У. Жылкі «Пожні», выпушчанага выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Мусім засведчыць, што гэта другое вяртанне сучаснаму чытачу творчасці паэта—у 1970 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў складзены У. Калеснікам зборнік «Вершы».

**А. КУНЦЭВІЧ.**

*НАТАТКІ НАТУРАЛІСТА: ЛІПЕНЬ*

# БАГАЦЦІ ЗЯЛЁНАЙ АПТЭКІ



У зеніце лета. Яно шчодра буяе ўсімі фарбамі квітнеючай прыроды, зіхаціць яркімі сонечнымі прамянямі, вабіць ласкавай цеплынёй. Пачалася пара збору ягад, грыбоў, лекавых раслін.

У апошні час нарыхтоўка карысных траў, сунквеццяў, карэнішчаў стала не менш папулярнай, чым паходы па суніцы ці маслякі. На Беларусі вядома прыкладна 270 відаў дзікарослых лекавых раслін — адна шостая частка ўсёй флоры. Пачатак масавага збору большай іх часткі прыпадае на ліпень і дасягае свайго апагея ў жніўні.

Здараецца, людзі лічаць цудадзейнымі раслінныя багацці нетутэйшай, іншаземнай флоры. І калі ўрач раіць піць, напрыклад, адвар талакнянкі, то знойдзецца хворы, які не паверыць у такі «просты» сродак. Але разам з тым, яшчэ нашы продкі ведалі цудадзейную сілу сціплага васілька, крапівы, дзьмухаўца, трыпутніку, палыну, рамонку, кмену. Засталіся папулярнымі яны і ў сучаснай медыцыне, якая вядзе іх масавую нарыхтоўку ў гэтыя ліпеньскія дні.

Так, адны лекавыя расліны сустракаюцца часта, растуць усюды. Іншыя радзей, некаторыя нават цяжка распазнаць, і трэба добра ведаць умовы іх знаходжання і прыкметы, каб не памыліцца пры зборы. Цмін пясчаны, калган, дзераза, асобныя віды папараці, сінюха, ваўчкі, ятрышнікі — вельмі каштоўная сыравіна, але не заўсёды іх можна знайсці. Ёсць і такія лекавыя расліны ў нашай флоры, якія не нарыхтоўваюцца з-за таго, што іх мала і яны знаходзяцца пад аховай. Купальнік горны, дзераза-баранец, наперстаўка буйнакветная, першацвет веснавы занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, а што тычыцца купальніка, то ён ахоўваецца па ўсёй краіне і занесены ў Чырвоную кнігу СССР.

Часцей за ўсё лекавыя расліны можна сустрэць у лясах, асабліва сасновых, нямала іх і ў шыракалістых і яловых. У ліпені сасняки багатыя лістом брусніц, талакнянкай, суніцамі, чаборам, чарніцамі. На тэрыторыі Беларусі яны даволі распаўсюджаны і збіраецца іх нямала.

У забалочаных сасняках на верхавых балотах абавязкова знойдзецца багун, можна сустрэць маленькую насякомаедную расіцу. Гэтыя балоты заўсёды пакрыты тоўстым, іншы раз у некалькі метраў, слоем сфагнавага моху—таксама каштоўнай сыравінай для медыцыны.

У яловых і шыракалістых лясах, а менавіта ў дубровах, ельніках з дубам, ліпай, клёнам і іншых змешаных лясах, таксама ўбачыш нямала лекавых траў. Тут можна выкарыстоўваць не толькі травяністыя, але і дравяністыя расліны: брызгліну, крушыну, маліну, шыпшыну.

Ліпень у нашай свядомасці непарыўна звязаны з нарыхтоўкай ліпавага цвету. Бывае, убачыш такое дрэва на лясным лузе і спынішся ў радасным здзіўленні. Магутнае голле звісае ледзь не да зямлі, і ўсё яно, ад самага нізу да вяршаліны, усыпана соладка пахнучымі кветкамі з зялёным крылцам збоку суквеццяў. Сабраць ліпавы цвет з ніжніх галінак не цяжка. І так прыемна пабыць некаторы час ля дрэва, слухаючы, як мноства пчол «працуе» на ліпе, здаецца, што і само дрэва гудзе і спявае.

Не толькі ў сухіх светлых лясах растуць лекавыя расліны. Забалочаныя алешнікі, якіх нямала ў Беларусі, у сярэдзіне лета багатыя і крушынавай карой, і крапівой, і чорнымі парэчкамі, і малінай.

Па сыраватых хмызняках, у далінах рэк і на ўскрайках балот расце цар усіх лекавых раслін — валяр'ян. На балотах сустракаецца пахучы аер, яго многа, і нават збор карэнішча не пашкодзіць яго густым зараснікам.

Нарэшце, на пашах, пустэчах у населеных пунктах, на асушаных тарфяніках таксама мноства лекавай флоры. У ліпені тут збіраюць сардэчнік. А якая карысная гэтая расліна! Сама назва гаворыць пра яе прызначэнне. Паблізу чалавечага жытла можна ўбачыць падбел і дзьмухавец, баркун і святаяннік, рамонак і чыстацел, піжму і палын. У гэтую пару на палях сустракаюцца фіялка трохколерная, жаўтушнік, васілёк, сушаніца балотная, хвошч палявы, стрэлкі.

У Савецкім Саюзе штогад нарыхтоўваюць звыш 40 тысяч тон лекавых раслін. Даволі многа сыравіны пастаўляе для фармацэўтычнай прамысловасці і Беларусь. Адных відаў можна назбіраць штогод па некалькі тон на раён, іншых — лічаныя кілаграмы. Для рацыянальнага выкарыстання зараснікаў і іх аховы ў Беларусі арганізаваны дванаццаць дзяржаўных заказнікаў дзікарослых лекавых раслін. Гэта буйныя лясныя масівы з прамысловымі запасамі траў, кустарнікаў, дрэў.

Запаведнікі рэспублікі — Бярэзінскі, Прыпяцкі, Белавежская пушча—сапраўдныя скарбніцы зялёных лекаў, але збор сыравіны там, вядома, не праводзіцца. Гэтыя тэрыторыі з'яўляюцца прыродным сховішчам разнастайных раслінных рэсурсаў нашай рэспублікі.

**Наталля КАЗЛОЎСКАЯ.**

# ВЯСЁЛЫЯ ГЕРОІ МАЛАДОГА ГАНЧАРА



Усякі раз, бываючы ў майстэрні маладога ганчара Сяргея Какшынскага, не перастаеш здзіўляцца, як звычайная гліна ў руках майстра ажывае, ператвараецца ў арыгінальныя, непаўторныя па каларыту і характару фігуркі. Сумных персанажаў тут няма, у кожным з іх — усмешка.

Працуе Сяргей Какшынскі фармоўшчыкам на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва. Родам ён з Барысаўскага раёна, з сялянскай сям'і. Любоў да народнай творчасці, па яго словах, нарадзілася ў дзяцінстве. Часта бываў на мнагалюдных кірмашах, там у гушчыні народа знаходзіў тэмы для будучых работ. Пачутае і ўбачанае запісваў і замалёўваў, і гэтыя назіранні потым сталі ўвасабляцца ў гліняных мініяцюрах.

Сярэднюю школу скончыў у сваёй вёсцы, затым было вучылішча кінамеханікаў, працаваў па спецыяльнасці, але цягнула іншае.

Нечаканай і цікавай была першая «сустрэча» з глінай. Сяргей пайшоў у лес па грыбы, а замест грыбоў прынёс у кошыку гліну. Паспрабаваў ляпіць і захапіўся. Першую работу і цяпер захоўвае як памяць аб пачатку сваёй творчай дзейнасці.

Пазней Сяргей прыйшоў працаваць на камбінат прыкладнога мастацтва. Спрабаваў многія матэрыялы, але перавагу аддаў чырвонай гліне. У рабоце Сяргей Какшынскі шырока выкарыстоўвае традыцыйныя беларускія формы, а таксама ўключае свае, уласныя элементы і прапорцыі. Арыгінальнасць кампазіцыйных рашэнняў, своеасаблівае аўтарскае бачанне майстра падкрэсліваюць індывідуальнасць кожнай работы, яе непаўторную прыгажосць.

Майстар многа працуе. Гэта заняткі жывапісам, малюнкам з натуры, лепка, чытанне спецыяльнай літаратуры. Працэс пазнання ў мастацтве дапамагае адкрываць нешта новае, сваё.

Сяргей Какшынскі гаворыць, што гліна нечым блізкая да беларускай ільнянай тканіны, вытканай уручную на кроснах, але не па якасці, а па духу. Цікавасць да тканых вырабаў у яго непарыўна звязана з глінай. У сваёй рабоце ён не абыходзіцца без ільнянога кавалачка, якім раскачвае камяк гліны. Фактура тканіны адбіваецца на гліне, і тым самым фігурка нібыта апранаецца ў цёплы лён. З веданнем справы адлюстроўвае майстар у сваіх творах быт беларускай вёскі, тонка ўлоўлівае ў вобразах персанажаў характэрныя рысы людзей пэўных прафесій, гумарыстычныя сітуацыі.

Сяргей Какшынскі — малады майстар. Планы яго вялікія: новыя творы, падрыхтоўка персанальнай выстаўкі.

**Алена КРАСІЧКАВА.**

**НА ЗДЫМКАХ: ганчар Сяргей КАКШЫНСКІ; работы майстра.**

**Фота І. КУРМАНОВІЧА.**





## СПОРТ

20 ліпеня патух агонь Гульняў добрай волі ў Маскве. Але і да гэтага часу не заціхае ва ўсім свеце шырокі рэзананс на тое незабыўнае і яркае свята. Бо, як выказваецца друк многіх краін, яно—больш чым проста буйное спартыўнае мерапрыемства. Гульні сталі пераканаўчым сведчаннем важнасці ўкладу, які спорт можа ўнесці ў справу ўмацавання міру.

Паралельна са стартамі ў Маскве прайшло нямала першынстваў і турніраў, што таксама заслугоўвалі ўвагі аматараў спорту. Вось толькі некалькі з іх.

У невялікім беларускім горадзе Пінску прайшоў першы чэмпіянат Еўропы по мотаболу. Залатыя медалі ўпэўнена выйгралі спартсмены Савецкага Саюза. Яны былі мацнейшымі за ўсіх сваіх сапернікаў: каманды Францыі, Балгарыі і ФРГ.

Цікава, што мотабалісты СССР пасля чэмпіянату ў паказальных сустрэчах перамаглі зборную Еўропы—5:2 і 7:3.

Шмат клопату прынесла першынство свету сярод юніёраў па лёгкай атлетыцы арганізатарам і гаспадарам у Афінах. Сто сорак восем краін прыслалі сюды сваіх прадстаўнікоў. Такога рэкорду не ведаў дагэтуль ні адзін турнір, уключаючы Алімпійскія гульні.

Тым прыемней для нас поспех лёгкаатлетаў Савецкага Саюза. Яны, як і юніёры Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, заваявалі 19 узнагарод, з іх—6 залатых. Прычым прадстаўнікі Беларусі занялі на гэтых спаборніцтвах два першыя, адно другое і чатыры трэція месцы.

Далей за ўсіх, на 78 метраў 84 сантыметры кінуў кап'ё мінчанін Уладзімір Сасімовіч. А ў кіданні молата спрэчку за чэмпіёнскі тытул вялі толькі беларускія спартсмены Віталь Алісевіч і Валерый Губкін. У іх адпаведна першае і другое месцы.

Доўгія гады спартыўны свет захапляўся праслаўленым беларускім барцом Аляксандрам Мядзведзем. І цяпер можна з упэўненасцю гаварыць, што ў яго ёсць дастойны пераемнік. Гэта... сын Аляксей. На нядаўнім розыгрышы Кубка свету па вольнай барацьбе сярод юніёраў Аляксей Мядзведзь, Аляксандр Саўко, Іван Хітрушка і Ігар Міхальчук з Беларусі ў складзе зборнай СССР занялі першае месца. Яны ж перамаглі і ў асабістым заліку.

Вялікі рэзерв у барцоў Беларусі. Аб гэтым сведчыць зусім свежы факт. На IX летняй Спартакіядзе народаў СССР барцы вольнага стылю набралі найбольшую колькасць ачкоў.

Вельмі цікавыя спаборніцтвы чакаюць аматараў спорту нашай рэспублікі ў бліжэйшы час. 8 жніўня ў Мінску пачнецца X чэмпіянат свету па баскетболу сярод жанчын. Некалькі беларускіх спартсменак уключаны ў склад зборнай СССР.

Праведзена жараб'ёўка першага этапа розыгрышу еўрапейскіх Кубкаў па футболу. У турніры Кубка УЕФА мінскае «Дынама» згуляе з камандай «Раба эта» з Венгрыі.

Спартыўны летні сезон у разгары. І ён, несумненна, падорыць аматарам яшчэ нямала цікавых імгненняў барацьбы і рэкордаў.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1223